**Ганна Басава**
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

# КЛЮЧАВЫЯ ЯКАСЦІ КВАЛІФІКАЦЫІ СУЧАСНАГА ЖУРНАЛІСТА

Вытворчасць, распаўсюджанне і выкарыстанне медыяпрадукцыі ў сучасных умовах ажыццяўляецца на высокім індустрыяльным узроўні з выкарыстаннем усё больш дасканалых тэхнічных сродкаў і адпаведных тэхналогій. За кошт гэтага ў сферы інфармацыі і камунікацыі не толькі адбываюцца тэхналагічныя і арганізацыйныя пераўтварэнні, але і ўзнікаюць новыя медыяструктуры, пашыраецца іх узаемапранікненне і ўзаемадзеянне з іншымі сістэмамі, а ў цэлым мяняецца і сама журналістыка, не змяняючыся, аднак, у сваёй фундаментальнай сутнасці. Развіццё і дынаміка прафесіі, што ўключана ў структуру шырокіх грамадскіх сувязяў рознага ўзроўню, патрабуе ад медыяспецыялістаў пастаяннага ўдасканалення кваліфікацыі і росту творчага майстэрства, пераважнае значэнне для якой на сёння мае кампетэнтнасць журналіста ў пэўных прадметных галінах ведаў.

Усё большае значэнне набывае ўменне даваць ацэнку і рабіць адбор інфармацыі па ступені яе важнасці і значнасці. Падзеі і працэсы, што асвятляюцца ў СМІ, становяцца ўсё больш складанымі, аб'ёмы апрацоўваемай журналістамі інфармацыі пастаянна растуць. Каб аналізаваць новую інфармацыю, разумець узаемасувязі паміж рознымі фактамі і з'явамі, журналіст павінен мець добрую агульнаадукацыйную падрыхтоўку. Але толькі прадметных ведаў ужо недастаткова. Сёння ад журналісаў патрабуюцца

здольнасці і ўменні, якія называюць «ключавымі якасцямі кваліфікацыі», ці *«soft skills»*. Гэтае паняцце ўключае ў сябе кампетэнтнасць у сферы методыкі выкарыстання ведаў, што, у сваю чаргу, прадугледжвае ўменне камбінаваць і дапаўняць атрыманыя веды, прымаць рашэнні і вырашаць пытанні, а таксама кампетэнтнасць у сферы сацыяльных адносін і ў сферы новых сродкаў інфармацыі. Усё гэта ў цэлым падкрэслівае неабходнасць пастаяннага набыцця журналістамі пэўных тэарэтычных і прыкладных ведаў, інтэграваных, у прыватнасці, у сістэму павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў.

Неабходнасць у павышэнні кваліфікацыі журналісцкіх кадраў і іх перападрыхтоўцы дыктуецца істотнай трансфармацыяй аб'ектыўных сацыяльных, палітычных і эканамічных умоў дзейнасці журналіста, абумоўленых глабалізацыяй, эканамічнай інтэграцыяй і ўкараненнем новых тэхналогій. Аналіз рынку СМІ Рэспублікі Беларусь паказвае, што попыт на прафесійных журналістаў высокі і мае тэндэнцыю да росту.

Думаецца, што менавіта сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў у бліжэйшы час значна паскорыць сваё развіццё. З гэтай мэтай неабходна ствараць умовы для павышэння ўзроўню яе навукова-метадычнага забеспячэння, разгледзець магчымасці супрацоўніцтва з адпаведнымі структурамі блізкага і далёкага замежжа, разам з якімі стварыць цэнтр каардынацыі і падрыхтоўкі адпаведнай метадычнай літаратуры.